Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 СНЕЖНЯ 2014 г. СУБОТА № 245 (27855) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Прэзідэнт:**

**Галоўнае цяпер — развіццё эканомікі, усё трэба рабіць дзеля працоўных калектываў.**

**Трэнд на кантроль за цэнамі ў краіне захаваецца назаўсёды.**

СТАР. 2



**«Нашы дзеці»: падарункі да Новага года**

СТАР. 3



**Жыллё і рынак: абвалу кошту не чакаецца**

СТАР. 4



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# КАБ ЗБЫЛІСЯ АГУЛЬНЫЯ МАРЫ

## БЕЛАРУСЬ — НАШ ДОМ, ПРА ЯКІ ТРЭБА КЛАПАЦІЦЦА, ЯК ПРА САМАЕ РОДНАЕ, ДАРАГОЕ МЕСЦА НА СВЕЦЕ

**Такі наказ з вуснаў Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі пачулі ўдзельнікі навагодняга дабрачыннага свята рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці». На галоўную ёлку краіны былі запрошаны 2 тысячы 370 дзяцей ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў з усіх рэгіёнаў краіны, паведамляе БЕЛТА.**

У склад удзельнікаў свята былі ўключаны дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, выхаванцы дзіцячых інтэрнатных устаноў, дзеці-інваліды, а таксама дзеці са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў. У галоўным навагоднім свяце прынялі ўдзел выхаванцы кадэцкіх вучылішчаў; дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу Следчага камітэта, супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і фінансавых расследаванняў, бацькі якіх загінулі або сталі інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў; дзеці, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. На свята таксама былі запрошаны дзеці, узнагароджаныя па выніках раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, конкурсаў, спаборніцтваў, якія маюць поспехі ў грамадскай рабоце. Акрамя таго, сярод удзельнікаў дабрачыннага свята для дзяцей былі навучэнцы Вільнюскай гімназіі імя Францыска Скарыны.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# НАСТРОЙ — СЯМЕЙНА-СВЯТОЧНЫ



Мінскі будаўнік Дзмітрый Лойка з 10-гадовым сынам Максімам у касцюмах Дзядоў Маразоў спяшаюцца на пераднавагоднія святы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | –5° |
| Віцебск | –7° |
| Гомель | –5° |
| Гродна | –5° |
| Магілёў | –7° |
| Мінск | –7° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.12.2014 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 11030,00 |
| Еўра | 13440,00 |
| Рас. руб. | 202,00 |
| Укр. грыўня | 702,10 |

ISSN 1990 - 763X

## «Ведомости»: Аляксандр Лукашэнка — палітык года

**Расійскае выданне «Ведомости» ў спецыяльным праекце «Персона года» назвала Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку палітыкам года, паведамляе БЕЛТА.**

Прэзідэнт Беларусі ў 2014 годзе праявіў сябе надзвычай умелым дыпламатам і гаспадарчым дзеячам, з самага пачатку падзей у Кіеве заняў узважаную пазіцыю, адзначае выданне.

«У выніку Мінск стаў галоўнай пляцоўкай для мірнага ўрэгулявання, мінскі фармат — адзіна магчымым, па прызнанні ўсіх зацікаўленых бакоў, для працягу перамоў, а сам Лукашэнка — ці не галоўным міратворцам у Еўропе», — гаворыцца ў паведамленні.

## КАБ ЗБЫЛІСЯ АГУЛЬНЫЯ МАРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Звяртаючыся да юных удзельнікаў свята, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Усе вы, вядома, чулі крылатую фразу «спяшайцеся рабіць дабро». І я заклікаю да гэтага не толькі дарослых, але і нашых юных грамадзян. Цяпер самы час для добрых спраў. Проста паглядзіце вакол, што і як можна зрабіць лепшым. А мы, дарослыя, абяцаем вам, што паклапоцімся аб міры і дабрабыце на нашай зямлі», — сказаў Прэзідэнт. «Кожны з вас можа зрабіць нешта добрае для сваёй краіны. Тым больш што надыходзячы год аб'яўлены Годам моладзі — значыць, гэта і ваш год», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Вы ведаеце, што вельмі важна марыць. Запаветныя жаданні маюць дзіўную ўласцівасць — яны збліжаюць людзей і, самае галоўнае, робяць іх лепшымі і дабрэйшымі. Так адбываецца таму, што ўсе мы марым пра адно і тое ж. Усе мы хочам здароўя, шчасця родным і блізкім, працвітання сваёй Радзіме, міру на ўсёй зямлі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусам, каб збыліся іх агульныя мары, трэба працаваць разам, упэўнены кіраўнік дзяржавы. «Вядома, гэта няпроста. Шлях да поспеху не бывае лёгкім, але ён можа быць вельмі цікавым», — сказаў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, перад падрастаючым пакаленнем адкрываецца вялікі свет ведаў. Прэзідэнт Беларусі папрасіў удзельнікаў свята, каб яны не ўпускалі магчымасці вучыцца. «Трэба вучыцца, трэба атрымліваць веды, таму што гэта фундамент вашага жыцця», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт таксама пажадаў дзецям, каб яны хутчэй адкрылі ў сабе скрытыя здольнасці.

«І не думайце, што вы яшчэ школьнікі і вельмі маладыя для вялікіх спраў. Вялікія перамогі, вялікія справы складаюцца з маленькіх дасягненняў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт закрануў актуальную для дзяцей, іх бацькоў і педагогаў тэму — удасканаленне навучальнага працэсу. Гаворачы, у прыватнасці, пра шосты школьны дзень, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што па суботах дзецям трэба займацца любімымі карыснымі справамі. На думку кіраўніка дзяржавы, у школу ў гэты дзень трэба прыходзіць на спартыўныя спаборніцтвы, на ўрокі працоўнага навучання, каб стварыць нейкія вырабы, каб дзецям было цікава.

Што датычыцца прапаноў пазбавіць школы ад неабходнасці збіраць макулатуру і металалом, то яны, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, яму незразумелыя. «Трэба больш канкрэтных добрых спраў, якія будуць прыносіць карысць дзяржаве, прадпрыемствам, калектывам, вашым бацькам, а значыць, і вам», — адзначыў Прэзідэнт, звяртаючыся да ўдзельнікаў свята.

Кіраўнік дзяржавы заклікаў падрастаючае пакаленне заўсёды і ўсюды быць вернымі і надзейнымі сябрамі, таму што дружба ў Беларусі заўсёды была ў пашане. Прэзідэнт таксама пажадаў, каб дзеці і маладыя людзі больш цанілі жывыя адносіны, таму што электронныя прылады і інтэрнэт ніколі не заменяць сапраўдных сяброў, іх падтрымкі і ўдзелу.

«Каб наша Радзіма станавілася багацейшай і прыгажэйшай, любіце яе. Звязвайце з ёй сваю будучыню. Пакольні дом, які любіць, абавязкова становіцца больш утульным, прыгожым і гасцінным. Беларусь — гэта наш з вамі агульны дом, і мы павінны разам клапаціцца пра яго, як пра самае роднае, дарагое месца на свеце», — падкрэсліў беларускі лідар.

## РАЗБІРАЦЦА БУДУЦЬ РАЗАМ

### Пошукам вінаватых у сітуацыі з пастаўкамі беларускай прадукцыі зоймуцца следчыя органы Беларусі і Расіі

Адпаведныя даручэнні былі дадзены прэзідэнтамі Аляксандрам Лукашэнкам і Уладзімірам Пуціным, паведаміў памочнік Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў.

Паводле яго слоў, калі адпаведная тэма абмяркоўвалася прэзідэнтамі Беларусі і Расіі ў Маскве, то расійскі лідар адзначыў, што гэтыя рашэнні прымаліся без яго ведама. «Таму запрасілі і кіраўніка расійскай мытні, Данкверта (кіраўнік Рассельгаснагляда Сяргей Данкверт. — Заўвага БЕЛТА). І яны спрабавалі апраўдацца. Але як можна апраўдацца Рассельгаснагляду, калі па нейкіх парушэннях вы адразу закрываеце 21 прадпрыемства, а потым пачынаеце правяраць... А там, аказваецца, нармальная вытворчасць еўрапейскага ўзроўню з усімі стандартамі, з добрай прадукцыяй. Будуць разбірацца, аж да крымінальных спраў», — сказаў памочнік Прэзідэнта Беларусі.

Аляксандр Радзькоў падкрэсліў, што Прэзідэнт Беларусі заўсёды паслядоўна выступаў за развіццё інтэграцыі на постсавецкай прасторы ў розных фарматах, хоць фарміраванне саюзных структур праходзіла не без праблем. Цяжкасці ўзнікалі ў тым ліку па прычыне розных падыходаў да фарміравання рыначнай эканомікі, выкарыстання тых ці іншых спосабаў гаспадарання. Як вынік, раз-пораз узнікалі гандлёвыя войны, пытанні транзіту, мытных пошлін.

«Хочацца з намі працаваць на роўных, так, каб гэта было ўзаемавыгадна, мы згодны і на Саюзную дзяржаву, і на Мытны саюз, і на ЕАЭС, але так, каб гэта было сумленна», — падкрэсліў ён.

«Наш Прэзідэнт ніколі не паступіцца інтарэсамі беларускага народа. Менавіта таму ён народны прэзідэнт — яму вераць, яго падтрымліваюць, разумеючы, што трэба мець моцную асобу, якая можа і краіну развіваць, і на самым высокім узроўні адстойваць інтарэсы кожнага чалавека ў Беларусі, і яшчэ дапамагчы сур'ёзна суседзям», — сказаў Аляксандр Радзькоў.

Разам з тым, ён выказаў упэўненасць, што праблемныя пытанні ўдасца ўрэгуляваць, у тым ліку дзякуючы даверальным адносінам паміж прэзідэнтамі Беларусі і Расіі.

## ЭКАНОМІКА ПАВІННА ПРАЦАВАЦЬ

### А трэнд кантролю за цэнамі захаваецца назаўсёды

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную актуальным пытанням эканамічнага развіцця краіны, паведамляе БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы заявіў аб нармалізацыі па праблемных пытаннях у развіцці эканомікі: «Час, у які мы праводзім гэту нараду, не такі драматычны. Больш за тое, можна сказаць, што сітуацыя па тых праблемных пытаннях, якія так востра стаялі яшчэ тыдзень таму, складваецца нармальна», — сказаў ён.

Як адзначыў Прэзідэнт, апошнім часам быў прыняты шэраг рашэнняў, якія не вітаюцца асобнымі групамі кіраўнікоў. «Гэта натуральна: некаму не падабаецца падаражэлая валюта; некаму, што мы ўзялі пад кантроль цэнаўтварэнне, а некаму, што мы падтрымліваем айчыннага вытворцу». «Пры гэтым трэба разумець, што з усіх бед мы выбіралі найменшую. І вырашаючы комплекс пытанняў, мы вызначылі галоўнае, без якога не можа быць вырашэння іншых. Гэта стабільнасць на валютным рынку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Прыняўшы шэраг рашэнняў, мы разумеем, што яны маюць пэўныя вынікі, у тым ліку, акрамя пазітыўных, і негатыўныя. Галоўнае цяпер — развіццё эканомікі, — заявіў Прэзідэнт. — Эканоміка павінна працаваць. Усё трэба рабіць у імя работы працоўных калектываў, таму што там нашы людзі — беларускі народ, які пасля свят і да іх павінен прыйсці на рабочыя месцы, працаваць і атрымліваць заработную плату. Вось уся логіка».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што на сённяшні дзень самае галоўнае пытанне, якое стаіць на парадку дня, — вынікі прынятых рашэнняў: «Негатыўныя вынікі трэба ўстараняць, пазітыўныя тэндэнцыі — падтрымліваць. На гэта я кожны дзень арыентаваў урад да нашай нарады».

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад кіраўніцтва ўрада далажыць аб тым, што зроблена за мінулы тыдзень па стабілізацыі эканамічнага становішча ў краіне і вырашэнні пастаўленых задач.

Прэзідэнт абураны тым, што асобныя чыноўнікі арыентуюць бізнес на тое, што кантроль за цэнаўтварэннем у краіне хутка будзе зняты і яны адаб'юць недаатрыманую выгаду. «Нашы асобныя нягоднікі-чыноўнікі арыентуюць, як мне далажылі (і я пераканаўся ў гэтым), прадпрымальнікаў, камерсантаў і рознае жуллё, што вы, маўляў, пацярпіце, недзе 9-га, 15-га мы тут усё адпусцім, вы потым адаб'яце ўсё, што вы цяпер не атрымалі, — сказаў Прэзідэнт. — Людзі проста прасіцца... ведаеце, куды. Я хачу заявіць пра тое, што трэнд, як модна сёння гаварыць, на кантроль за цэнамі ў краіне захаваецца назаўсёды».

«Мы зрабілі ўсё для станаўлення нармальнага гандлю ў краіне. Нават калі заўтра не будуць больш стварацца гандлёвыя прадпрыемствы, наяўнасць у нас іх і пасярэднікаў неймаверная. Мы абыдземся і без новых. Але тых, што функцыянуюць, прымусім працаваць так, як належыць. Я ўжо сказаў, калі яны не пачулі, або ва ўрадзе не ацанілі, — 2-3 працэнты рэнтабельнасці. Возьмем кожны від тавару на кантроль, асабліва імпартнага», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Чакаць, штосьці недзе прыхаваць з разлікам на тое, што пасля 9-га-15-га вынікем і атрымаем неймаверныя цэны і яшчэ кішэнь больш наб'ём, не даводзіцца», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што мае намер да Новага года прыняць шэраг важных кадравых рашэнняў. «Заўтра мы абмяркуем шэраг кадравых пытанняў і прымем адпаведныя рашэнні. Іх будзе нямала», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

## ВАЛЮТНЫЯ ЎКЛАДЫ НЕ ЗАМАРОЗЯЦЬ

**<u>Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Надзея ЕРМАКОВА</u> заявіла, што ў банках назіраецца адток валютных укладаў. Людзі асцерагаюцца, што іх грошы могуць быць замарожаны. «Але я не бачу перадумоў для такіх дзеянняў. Нават неяк не ўкладаецца ў галаве: як гэта можна замарозіць валютныя ўклады? У нас такой сітуацыі няма. У любы час банкі могуць пазычыць валютныя рэсурсы ў замежных банкаў», — сказала старшыня Нацбанка. Па яе словах, не плануецца і паніжэння ставак па валютных укладах.**

Акрамя таго, Надзея Ермакова паведаміла, што на заказ Нацыянальнага банка ў Беларусь у бліжэйшыя дні даставяць яшчэ каля 200 млн долараў. Праблема дэфіцыту валюты ў абменніках вырашана: 23 снежня ў краіну была завезена вялікая сума наяўнай валюты. Надзея Ермакова адзначыла: «29-га яшчэ заказалі каля $200 млн. У асноўным попыт на долары; еўра карыстаюцца меншым попытам».

А ўвогуле, «з улікам сітуацыі не выключана, што 30-працэнтны збор будзе адменены раней. Можа быць, ён будзе адмяняцца паступова». Па словах кіраўніка Нацбанка, аналіз сітуацыі паказвае, што з 1 лютага збор будзе адменены ў любым выпадку. Надзея Ермакова звярнула ўвагу, што для дзеяння збору выбраны такі час, калі прадпрыемствы панясуць ад гэтага заходу найменшыя страты. У канцы снежня — пачатку студзеня шмат святочных дзён, калі гандлёвыя ўзаемаадносіны не такія актыўныя. Валюта на біржы прадпрыемствам не спатрэбіцца, адпаведна, ім не трэба будзе плаціць 30-працэнтную надбаўку.

### Няма прычын для росту цэн

**Пра гэта заявіў <u>міністр гандлю Валянцін ЧАКАНАЎ</u> па выніках нарады ў кіраўніка дзяржавы, дзе абмяркоўваліся актуальныя пытанні эканамічнага развіцця краіны. «Спажывецкі рынак сёння стабільны. Ніякіх адхіленняў па забеспячэнні насельніцтва таварамі няма. Ніякіх прычын, каб цэны на спажывецкім рынку раслі, сёння няма, таму мы і далей будзем працягваць працу па кантролі за цэнамі», — заявіў міністр.**

## УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС

### Банкам варта выконваць свае абавязацельствы любымі спосабамі

**За тыдзень пасля ўвядзення Нацбанкам часовага 30-працэнтнага збору пры куплі валюты юрыдычнымі і фізічнымі асобамі людзі паспелі некалькі разоў змяніць свой настрой адносна такога заходу — ад абурэння і пакупніцкага буму да здачы валюты ў абменнікі і адкрыцця дэпазітаў у беларускіх рублях. Спецыялісты пачынаюць казаць пра тое, што збор сваю місію выканаў і ад яго можна будзе адмовіцца раней 1 лютага 2015-га.**

#### ХАЦЕЛІ ПАДЗАРАБІЦЬ

Прынамсі, аб гэтым заявіў яшчэ ў сераду **дырэктар Інстытута эканомікі НАН Беларусі доктар эканамічных навук, прафесар Аляксей ДАЙНЕКА:** «Нам гэты заход у найбліжэйшай будучыні, думаю, не спатрэбіцца, паколькі сваю функцыю выканаў: у апошнія 3-5 дзён ён выступіў як заслон для таго, каб людзі не вывозілі валюту з краіны». Ён жа падкрэсліў, што 30-працэнтны збор — часовы заход у эканоміцы, выкліканы рэзкім адтокам валюты з рэспублікі. Гэта было звязана з тым, што насельніцтва ў вялікіх аб'ёмах пачало скупляць долары для набыцця тавараў у Расіі, дзе з прычыны дэвальвацыі цэны знізіліся. «Зразумела, што людзі захацелі падзарабіць, але калі пачаўся сур'ёзны адток валюты з золатавалютных рэзерваў, гэта на дзяржаўным узроўні спынілі. У Расіі сітуацыя ўжо стабілізуецца, долар пачаў аслабляцца да расійскага рубля. Адпаведна, кошты ў валюце там будуць расці», — лічыць прафесар.

**Аляксандр ЛУЧАНОК, загадчык аддзела Інстытута эканомікі НАН Беларусі, доктар эканамічных навук, прафесар,** лічыць, што новаўвядзенне з 30-працэнтным зборам не павінна насіць доўгачасовы характар. «Калі сітуацыя будзе цалкам стабільнай, новаўвядзенне варта было б адмяніць адразу пасля студзеньскіх свят», — гаворыць эксперт.

#### ДАВЕР ТРЭБА ЗАСЛУЖЫЦЬ

«Пры правядзенні грашова-крэдытнай палітыкі заўсёды варта ўлічваць рэфлексійнасць паводзін насельніцтва. Людзі нервова рэагуюць на нестандартнае развіццё сітуацыі, пачынаюць панікаваць і прымаць захады, за кошт якіх, па іх перакананні, яны выратуюць свае грошы», — адзначыў Аляксандр Лучанок і дадаў, што насамрэч насельніцтва стымулюе сваімі дзеяннямі неспрыяльны працяг працэсаў, вымушае дзяржаву рабіць крокі ў адказ: «У гэтым выпадку рэгулятар спрацаваў вокамгненна. Таму прыняцце 30-працэнтнага падатку было цалкам абгрунтаваным».

За 23 снежня чысты продаж валюты насельніцтвам склаў 8,8 млн долараў у эквіваленце, паведамілі ў Нацбанку са спасылкай на аператыўную інфармацыю, атрыманую ад банкаў. Станоўчыя тэндэнцыі працягваюць назірацца і на дэпазітным рынку. Тэрміновыя рублёвыя дэпазіты насельніцтва Беларусі за 20-23 снежня выраслі на 213,4 млрд.

Аднак ці захаваецца такая тэндэнцыя? «Калі ўзнікнуць нейкія непрадбачаныя абставіны, напрыклад, банкі не змогуць вяртаць дэпазіты ў валюце, то насельніцтва зноў можа пачаць паніку. Таму сёння самае галоўнае, каб банкаўская сістэма паказала сваю ўстойлівасць і выконвала абавязацельствы перад насельніцтвам любымі магчымымі спосабамі. Толькі пры такім падыходзе народ паверыць нашай банкаўскай сістэме. А калі пачнуць выдумляць нешта кшталту «зламаных камп'ютараў», прапаноўваць прыйсці за сваімі дэпазітамі праз месяц, адбудзецца тое, з чаго пачыналі», — сказаў карэспандэнту «Звязды» Аляксандр Лучанок.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

### <u>На думку дэпутатаў</u>

**«Звязда» папрасіла парламентарыяў выказаць свой погляд на сітуацыю, якая склалася сёння ў эканоміцы і ў грамадстве.**

**Андрэй НАУМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:**

— У дзяржаўным бюджэце закладзены ўсе рызыкі і, нагадаю, ён пралічаны з прафіцытам. Якой жа будзе эканамічная сітуацыя ў краіне ў наступным годзе, залежыць ад таго, як мы з вамі будзем працаваць. Натуральна, калі людзі будуць кідацца ў банкі скупляць валюту, гэта дасць не вельмі добры эфект. Усё ў нашых руках. Людзям не трэба хвалявацца наконт таго, што ў наступным годзе эканоміка пагоршыцца: усе пралічана з запасам.

**Мікалай ІВАНЧАНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы:**

— Разглядаць нашу дзяржаву ў адрыве ад іншых краін нельга. У свеце сёння пануе крызіс не толькі эканамічны, але і цывілізацыйны. Розныя катаклізмы ў суседніх краінах, нягледзячы на нашу незалежнасць, не могуць не закрануць Беларусь. У той жа час шмат што залежыць і ад нас, грамадзян краіны, нашай адказнасці. Не трэба паддавацца панікі; краіна перажывала і нашмат горшыя часы, калі на паліцах у магазінах нічога не было. Хацеў бы заклікаць да адыходу ад гэтага матэрыялізму: цяпер асабліва важна падумаць пра духоўнае.

**Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі:**

— Прагназаваць, як жа складзецца эканамічная сітуацыя ў нашай краіне ў наступным годзе, складана — наша эканоміка звязана з Расіяй. Вельмі многае залежыць ад таго, як усходняя суседка вырашыць свае ўнутраныя пытанні. На наступны год наш бюджэт разлічаны з прафіцытам, аднак гэты астатак павінен пайсці на выплату дзяржаўнага доўгу. У той жа час дадатковыя грошы з'яўляюцца, што натуральна, «падушкай бяспекі» для эканомікі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■ «Нашы дзеці»

# Каб не страцілі веру ў дабрыню...

**<u>Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу,</u> павіншаваў з калляднымі і навагоднімі святамі выхаванцаў з Бягомльскай дапаможнай школы-інтэрната Докшыцкага раёна. Тут жывуць і вучацца больш за 120 дзяцей з розных раёнаў Віцебшчыны ва ўзросце ад 7 да 16 гадоў.**

Па добрай традыцыі, штогод у перадсвяточныя дні Уладзімір Андрэйчанка прыязджае менавіта ў гэтую ўстанову. І па-за межамі правядзення дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» Уладзімір Паўлавіч цікавіцца, чым можна дапамагчы хлопчыкам і дзяўчынкам з нялёгкім лёсам.

Летась дзеці, якія пазбаўлены бацькоўскага клопату і пяшчоты, атрымалі ў падарунак мультымедыйную ўстаноўку, лыжы і канькі... Сёлета Уладзімірам Паўлавічам быў падораны тэлевізар, а кожнаму выхаванцу — набор салодкай прадукцыі. А **старшыня Докшыцкага райвыканкама Алег ПІНЧУК** ад імя мясцовай улады падарыў установе пыласос і дыван.

Вядома, дзятва кожны раз з нецярпеннем чакае прыезду Уладзіміра Паўлавіча і іншых гасцей. Пры дапамозе выхавацеляў і педагогаў рыхтуюць святочнае прадстаўленне. Так было і падчас чарговага візіту.

Уладзімір Андрэйчанка лічыць, што галоўная мэта акцыі «Нашы дзеці» — зрабіць так, каб дзеці з Бягомльскага інтэрната і аналагічных устаноў, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, не страцілі веру ў дабрыню. Дарослыя павінны зрабіць усё магчымае, каб у такіх дзяцей усё атрымалася па жыцці. Трэба дапамагчы ім, каб яны адчувалі, што не лішнія, а запатрабаваныя, як і іх раўнеснікі, у якіх ёсць бацькі...

— Кожны хлопчык і дзяўчынка мае права на любоў, на радаснае і шчаслівае жыццё. І не важна, жыве ён дома ці па волі лёсу страціў бацькоў... Клопат аб дзецях — адзін з галоўных прынцыпаў палітыкі дзяржавы, — падзяліўся думкамі Уладзімір Андрэйчанка.


Фота БЕЛТА.

Сярод усіх выхаванцаў інтэрната толькі ў сямі дзяцей бацькі не пазбаўлены правоў на выхаванне. Такіх у інтэрнаце называюць «хатнімі».

Дарэчы, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сказаў журналістам, што рэалізацыя дэкрэта № 18 дазволіла паменшыць колькасць нядобрасумленных бацькоў. Паводле яго слоў, з 2006 года, калі кіраўнік дзяржавы падпісаў вышэйзгаданы дэкрэт, колькасць грамадзян, якія пазбаўлены бацькоўскіх правоў, паменшылася на 60%. І калі ў 2005 годзе ў Беларусі функцыянавалі каля 180 школ-інтэрнатаў, сёння іх толькі 40.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Дом, дзе паселіцца радасць

**У Дзятлаве адкрыўся 22-гі па ліку дом сямейнага тыпу ў Гродзенскай вобласці.**


Фота БЕЛТА.

Як зазначыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ,** які ўдзельнічаў у цырымоніі адкрыцця, падтрымка дзяцей — прыярытэт сацыяльнай абароны ў вобласці і краіне, асабліва дзяцей-сірот і тых, што засталіся без апекі бацькоў. У рэгіёне ўзяты арыенцір на пераважнае выхаванне такіх дзяцей (іх сёння налічваецца 1,5 тысячы) у апякунскіх сем'ях, дамах сямейнага тыпу. «Выхаванне ва ўмовах сям'і — гэта лепшае, што мы можам для іх зрабіць»,— лічыць Уладзімір Краўцоў. Гэтая праца дазваляе скарачаць колькасць дзяцей у дзіцячых дамах і паступова адмаўляцца ад такіх устаноў.

Налета на Гродзеншчыне плануецца адкрыць яшчэ два дзіцячыя дамы сямейнага тыпу

■

# Падарункі да навагодняй ёлкі

**На Магілёўшчыне праходзяць святочныя мерапрыемствы ў рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці».**

Старт навагоднім святам даў Калядны баль у Палацы грамадзянскіх абрадаў, удзел у якім прынялі звыш 60 выхаванцаў абласнога кадэцкага вучылішча. Пад гукі чароўнай музыкі яны разам з дзяўчатамі з магілёўскіх гімназій танцавалі каля святочнай ёлкі і радаваліся падарункам.

Павіншаваць кадэтаў завітаў **міністр спорту і турызму Беларусі Аляксандр ШАМКО,** які перадаў ім спартыўную форму і абмундзіраванне на 120 мільёнаў рублёў. З пажаданнямі шчасця і дабрабыту выступіў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.** У падарунак ад абласной улады вучылішча атрымала кабінет фізікі і сучасную электронную дошку. Сертыфікат на набыццё мяккай мэблі і ласункі перадалі кадэтам магілёўскія мытнікі. Не менш каштоўнымі аказаліся падарункі ад прадстаўнікоў УУС Магаблвыканкама, абласнога ўпраўлення Беларусбанка, камітэта эканомікі аблвыканкама.

Дзіцячы дом сямейнага тыпу Міцкевічаў у шклоўскай вёсцы Мяжнік, дзе выхоўваецца 10 дзяцей, наведалі супрацоўнікі ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК РБ па Магілёўскай вобласці. Дзеці атрымалі ад Дзеда Мароза і Снягуркі салодкія падарункі, а таксама LCD-тэлевізар і запрашэнне ў Магілёў на навагоднюю казку-мюзікл «Лятучы карабель», якая адбудзецца на сцэне абласнога цэнтра творчасці.

З віншаваннямі і падарункамі наведалі цэнтр медыцынскай рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў з паражэннем ЦНС і апорна-рухальнага апарату курсанты і супрацоўнікі Магілёўскага інстытута МУС. Выхаванцам цэнтра яны перадалі DVD-плэеры, дзіцячую мэблю і ласункі. Дзеці, у сваю чаргу, падрыхтавалі для гасцей канцэртную праграму — спявалі песні і чыталі вершы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Надвор'е



# У НОВЫ ГОД — З МАРАЗАМІ

## АДНАК СНЕГУ НА СВЯТЫ СІНОПТЫКІ НЕ АБЯЦАЮЦЬ

**Напрыканцы года на тэрыторыі нашай краіны ўсталюецца сапраўды зімовае надвор'е, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму ў суботу, пры павышаным фоне атмасфернага ціску, будзе пераменная воблачнасць і пераважна без ападкаў. Вецер няўстойлівы слабы, а на дарогах захаваецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе мінус 3–9 градусаў. Захаваецца марознае надвор'е ў нядзелю і панядзелак. У нядзелю без істотных ападкаў, толькі па крайнім захадзе магчымы кароткачасовы снег, а ў панядзелак невялікі снег месцамі па краіне. У асобных раёнах на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ў межах мінус 6–13 градусаў, па паўночным усходзе — да 14–16 марозу. Удзень будзе ад 3 да 10 марозу. У апошнія два дні адыходзячага года толькі месцамі прагназуецца непрацяглы снег. Уначы на аўторак і сераду тэмпература паветра будзе трымацца ў межах мінус 7–14 градусаў, а пры праясненнях — да 15–18 марозу. Удзень — мінус 4–10 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першы дзень новага года толькі месцамі прагназуецца кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ў галоўную святочную ноч складзе мінус 5–12 градусаў, пры праясненнях — да 13–15 марозу. Удзень першага студзеня прагназуецца мінус 2–8 градусаў, месцамі — да 10 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ**

■


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

**Аукцион состоится 30 января 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67.**

*Аукционные торги проводятся в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов недвижимости и иного имущества, не относящегося к государственной собственности, а также аукционов на право заключения договоров аренды нежилых помещений, утвержденной приказом №77/2 от 04.08.2014 г.*

| № лота | Наименование предмета торгов; местонахождение имущества, условия оплаты | Краткая характеристика предмета торгов | Начальная цена, белорусских рублей (с НДС) | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Технологическое оборудование для изготовления конструкций из ПВХ, в количестве 14 единиц**<br>Гомельская область, г. Гомель, ул. Владимирова, 10<br>Условия оплаты: по соглашению сторон. | <u>Перечень оборудования:</u><br>1. Станок для обработки торцов импоста мод. KM212, 2004 г. в.;<br>2. Станок прямолинейной обработки кромки стекла мод. SE10M, 2013 г. в.;<br>3. Станок для фрезерования водоотливных канавок мод. ST263, 2004 г. в.;<br>4. Станок экономичный углозачистной мод. CA601, 2004 г. в.;<br>5. Копировально-фрезерный станок мод. FR224, 2004 г. в.;<br>6. Машина горячего прессования для стеклопакетов мод. RP-1500, 2010 г. в.;<br>7. Машина мойки и сушки стекла мод. TRW-1500, 2010 г. в.;<br>8. Одноголовочная ПВХ-сварочная машина мод. TK501, 2004 г. в.;<br>9. Пила для резки штапика, 2010 г. в.;<br>10. Пила с изменяемым углом резки 350 мм мод. KD350 (пневм.), 2005 г. в.;<br>11. Стенд для нанесения герм. ленты мод. TRT-1300, 2010 г. в.;<br>12. Установка для заполнения газом мод. TRG-2;<br>13. Установка компрессорная мод. СБ4/Ф-270LB75. 2010 г. в.;<br>14. Экстру дер бутила (хот-мелта), 2007 г. в.<br>**Все оборудование, бывшее в употреблении, находится в технически исправном состоянии** | 712 920 000 | 25 000 000 |

<u>Продавец:</u> Открытое акционерное общество «Гомельский завод «Коммунальник», 246034, г. Гомель, ул. Владимирова, 10.

<u>Организатор торгов:</u> Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Региональное инвестиционное агентство «Гомель-Инвест», г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67, тел. (0232) 25 49 00, факс (0232) 25 49 01.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на р/с 3012113129041 в Региональной Дирекции № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель платежа – ГП «РИА «ГомельИнвест», УНП 490779270. Назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе 30 января 2015 г.»

К участию в аукционе допускаются физические и юридические лица, индивидуальные предприниматели, (резиденты и нерезиденты Республики Беларусь), подписавшие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и подавшие своевременно следующие документы:

- заявление на участие в аукционе;
- платежное поручение (или иной платежный документ) о внесении задатка;

*юридическими лицами (резидентами Республики Беларусь):*

- доверенность представителя юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);
- копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

*представители физических лиц (резидентов Республики Беларусь);*

- нотариально заверенную доверенность;

*индивидуальным предпринимателям* – копия свидетельства о государственной регистрации;

*юридическими лицами (нерезидентами Республики Беларусь):*

- легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
- документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

*представители юридических и физических лиц (нерезиденты Республики Беларусь)* – легализованная в установленном порядке доверенность.

**Документы для участия принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67 по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 по 28.01.2015 г. включительно.**

Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, подавшие в установленный срок заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию **с 10.00 до 11.00 30 января 2015 г.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов.

Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить предмет торгов) обязан:

- подписать протокол о результатах аукциона;
- в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения торгов возместить Организатору вознаграждение, включая фактические затраты, связанные с организацией и проведением аукциона. Размер вознаграждения составляет 4% от начальной цены проданного с аукциона объекта и 5% от суммы превышения цены продажи объекта над начальной ценой, но не менее суммы фактических расходов;
- в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов;
- в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость предмета торгов, сформированную в установленном порядке.

Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона (единственным участником, не пожелавшим купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%), возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Задаток участника аукциона, ставшим Победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), засчитывается в счет окончательной стоимости предмета торгов.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (единственным участником) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет пятьдесят базовых величин за каждый случай нарушения.

Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Справки по тел. (0232) 25 49 00.

# ЧАС ПЕРАБОРЛІВЫХ ПАКУПНІКОЎ І КВАТАРАНТАЎ

## Эксперты жыллёвага рынку нерухомасці адзначаюць павелічэнне прапановы і ўзмацненне патрабаванняў да якасці кватэр з боку кліентаў

**Паводле інфармацыі аддзела кансалтынгу і аналітыкі агенцтва нерухомасці «Твая сталіца», арганізатары жыллёвага будаўніцтва ў Мінску амаль увесь год прытрымліваліся стабільных цэннікаў, а прадаўцы на другасным рынку кватэр «са скрыпам» згаджаліся на зніжкі.**

### Новабудоўля трымае кошты

На працягу адыходзячага года цэнаўтварэнне на першасным рынку жылля характарызавалася стабільнасцю, лічаць эксперты. Тут найбольш паказальным у плане цэнаўтварэння можна назваць перыяд з лютага па верасень, калі цэны былі ўраўнаважаны рынкавымі законамі і балансавалі на адзнацы ў 1670 долараў за квадратны метр. Невялікае павелічэнне коштаў у пачатку сезона стала пераходным «рэхам» тэндэнцый мінулых гадоў, якое сёлета ўвогуле на рынку не прыжылося. Прычынай уздыму сярэдняй цаны ў мінулым кастрычніку з'яўляецца клас «Камфорт», дакладней два новыя аб'екты гэтага класа якасці, якія выйшлі тады на рынак і характарызуюцца даволі высокімі нават для такога тыпу жылля коштамі. У лістападзе сярэдняя цана квадратнага метра новабудоўляў ад камерцыйных забудоўшчыкаў у параўнанні з кастрычнікам засталася практычна без змен — на ўзроўні 1720 долараў.

**Сярэднія цэны прапановы новабудоўляў камерцыйнымі забудоўшчыкамі ў лістападзе**

| У разрэзе класаў якасці | USD / кв. м |
|---|---|
| Эканом 1 | 1405 |
| Стандарт 2 | 1600 |
| Камфорт 3 | 1980 |
| Прэстыж 4 | 2470 |
| Сярэдняя 1 | 720 |

Самым шматлікім на першасным рынку жылля з'яўляецца клас «Стандарт». Гэты клас можна разглядаць як свайго роду «індыкатар» цэнаўтварэння на рынку. У параўнанні з кастрычнікам, ваганне сярэдняй цаны на новабудоўлі такога класа склала +1%, ці 10 долараў — да ўзроўню 1600 долараў за «квадрат», што тлумачыцца ўсяго толькі маркетынгавай палітыкай забудоўшчыкаў у дачыненні да асобных кватэр у праекце. У залежнасці ад колькасці пакояў, сярэдні кошт кватэр гэтага класа па выніках лістапада склаў 1670 долараў для аднапакаёвых, 1600 «зялёных» — для двухпакаёвых і 1560 долараў — для трохпакаёвых.

У той жа час у класе якасці «Прэстыж» (як самым дарагім з прадстаўленых сёння на рынку класаў якасці) сёлета адзначаецца адмоўная дынаміка: у параўнанні з пачаткам года, у лістападзе сярэдняя цана знізілася практычна на 5%, або на 120 долараў за квадратны метр. Гэта тлумачыцца тым, што пакуль яшчэ мала пакупнікоў маюць дастаткова грошай, якія дазваляюць набываць кватэру такога класа.

### Другасны рынак жылля адгукнуўся на слабы попыт

У лістападзе актыўнасць пакупнікоў на другасным рынку жылля Мінска працягвала сваё павольнае зніжэнне. Па выніках месяца, яе ўзровень адпавядаў перыяду канца вясны — пачатку лета, які характарызаваўся перавышэннем аб'ёму прапановы над аб'ёмамі забяспечанага попыту. На гэта адразу зрэагавалі і кошты прапановы — практычна па ўсіх раёнах горада, за выключэннем Маскоўскага і Кастрычніцкага, у лістападзе зафіксавана зніжэнне коштаў да 4%. Такое зніжэнне адзначана толькі ў дачыненні да прапановы. Цэны здзелак пры гэтым засталіся амаль на ранейшым узроўні. Зніжэнне коштаў прапановы ў існуючай сітуацыі цалкам зразумелае.

Канец года заўсёды выступае свайго роду «трывожным часам». Бо ніхто не ведае, што прынясе новы год. Таму, зніжаючы цэны прапановы, прадаўцы тым самым спрабуюць прыцягнуць пакупнікоў. Калі б прадаўцы наадварот пачалі падымаць цэны, нічога добрага з гэтага б не выйшла — аб'ём рэалізаванага попыту працягнуў бы зніжацца, а такім чынам, аб'ём прапановы — павялічвацца. І ў гэтым выпадку неўзабаве зноў быў бы запушчаны рыначны механізм прымусовага зніжэння коштаў на падставе аб'ектыўных законаў цэнаўтварэння. Гэта і зразумела, бо дзейнічае баланс попыту і прапановы.

Для пакупнікоў бягучую сітуацыю нельга назваць адназначнай. Пазіцыю чакання ў гэтым выпадку нельга назваць эфектыўнай, бо складана спрагназаваць эканамічную сітуацыю і тое, як будуць залежаць ад яе паводзіны рынку на наступны год. Таму з улікам велічыні аб'ёму прапановы на рынку, дзе вялікі выбар кватэр самых розных класаў якасці і цэнавых узроўняў, канец года выступае вельмі спрыяльным часам для вырашэння свайго жыллёвага пытання, упэўнены спецыялісты.

Сярэдняя цана квадратнага метра кватэр стандартных спажывецкіх якасцяў па выніках лістапада сфарміравалася на ўзроўні 1605 долараў, дзе ў аднапакаёвых кватэрах «квадрат» каштуе 1730 долараў, двухпакаёвых — 1560 долараў і 1420 долараў — у трохпакаёвых.

У выпадку пошуку кватэр, якія маюць, як мінімум рамонт «эканом-класа» і базавы набор мэблі, трэба ўлічваць тое, што іх рынкавы кошт, як правіла, стане вышэйшым за цэннікі стандартнага жылля прыкладна на 10%. Цяпер пакупнікі становяцца больш пераборлівымі. Безумоўна, найпершым крытэрыям пошуку кватэры па-ранейшаму выступае цана, але ў дадатак да аб'ектыўнай цаны кватэра павінна быць і ў годным стане. Бо неабходнасць сур'ёзнага рамонту значна павялічвае выніковы сабекошт кватэры.

### 300 долараў — ужо не мяжа?

На рынку доўгатэрміновай арэнды жылля напярэдадні наступлення новага года склалася досыць супярэчлівая сітуацыя: прапанова значна перавышае попыт, але пры гэтым кошты ўжо другі месяц працягваюць стаяць на месцы, спыніўшы сваё зніжэнне яшчэ ў пачатку кастрычніка. Актуальныя цэны арэнды кватэр, якія прапануюцца без мэблі і ўсяго толькі ў здавальняючым стане, склалі 300 долараў у месяц для аднапакаёвых, 380 долараў — для двухпакаёвых і 440 долараў — для трохпакаёвых. Пры гэтым кошт камунальных плацяжоў у гэтых сумах не ўлічваецца.

Калі ж казаць пра кватэры «гатовыя да пражывання», а менавіта, якія маюць у сваім складзе базавы набор мэблі (кухня, стол, крэслы, канапа/ложак, шафа-купэ), бытавую тэхніку (халадзільнік, тэлевізар, мікрахвалевая печ, пральная машына-аўтамат) і акуратны рамонт (падлогі лінолеум або ламінат, шпалеры без істотных дэфектаў, сцены ваннага пакоя і санвузла з кафляй), то іх кошт арэнды пачынаецца ад 340 долараў для аднапакаёвых кватэр. Падобнае двухпакаёвае жыллё можна адшукаць на рынку за 400-420 долараў, а цэннік арэнды трохпакаёвых кватэр пачынаецца ад 460 долараў.

На рынку захавалася тэндэнцыя мінулых месяцаў, калі найбольшы попыт існаваў на аднапакаёвыя кватэры. Аднак, калі раней для арандатараў мінімальнай планкай пры заказе быў кошт на ўзроўні 300 долараў, то цяпер значна пачасціліся запыты кватэр коштам да 270 долараў. Праўда такіх кватэр (у добрым стане) цяпер на рынку практычна няма. Таму пры пошуку падобнага жылля не варта разлічваць на камфорт пражывання.

Таксама за апошні месяц павялічыўся попыт на арэнду асобных пакояў. Але гэта вельмі вузкі сегмент, мэтавай аўдыторыяй якога выступаюць у асноўным студэнты. Але і яны, як правіла, разглядаюць гэты варыянт пражывання толькі як вымушаны і кароткатэрміновы.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 27.01.2015 г. в 15.00**
**по адресу: 220030, г. Минск, ул. Кирова, 18, 3-й этаж, пом. 99 (конференц-зал «Талер»).**

Организатором аукциона является
**республиканское унитарное предприятие «Президент-Отель»,**
**находящееся по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 18.**

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

1. Помещение № 48 площадью 31,6 кв.м на пятом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 805 800 рублей; размер задатка – 810 550; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.

2. Помещение № 54, площадью 57,1 кв.м, на пятом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 456 050 рублей; размер задатка – 145 600; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 29.12.2014 по 23.01.2015 с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00, по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 18, к. 602. Документы, поданные после 16.00 23.01.2015, не рассматриваются.**

*Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».*

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

*- перечисляет задаток на р/с № 3012000011054 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 192287408, ОКПО 381798305000, государственное предприятие «Президент-Отель»;*

*- подает заявление на участие в аукционе;*

*- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;*

*- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.*

Помимо указанных документов:

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и(или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 10 000 000 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефоны для справок: (8-017) 229-70-39, (8-029) 117-56-22.**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Тэндэнцыі

# АБВАЛУ КОШТАЎ НЕ БУДЗЕ

**Пасля ўвядзення ў Беларусі 30-працэнтнага збору на куплю валюты цэны на жыллё на другасным рынку сталіцы вырастуць у рублях, аднак у доларавым эквіваленце знізяцца прыкладна на 5%. Такі прагноз дае намеснік дырэктара па продажах на другасным рынку жылля групы кампаній «Твая сталіца» Святлана КУДЗЕЛКА.**

На яе думку, змены, якія адбываюцца ў фінансавай сферы, прывядуць да часовага зніжэння актыўнасці на рынку жылля. Зацішша на другасным рынку будзе доўжыцца прыкладна на працягу двух-трох тыдняў, а ажыўленне павінна адбыцца ўжо недзе ў студзені-лютым. Большасці прадаўцоў і пакупнікоў спатрэбіцца каля двух тыдняў на тое, каб асэнсаваць сітуацыю і прыняць для сябе нейкае рашэнне.

Істотную ролю цяпер адыгрывае і сезонны фактар. ПерадНавагодні перыяд традыцыйна вылучаецца нізкім попытам на жыллё, людзі рыхтуюцца да свят і стараюцца перанесці вырашэнне кватэрнага пытання на наступны год. Таму для рынку суцяшэннем можа быць тое, што такія кардынальныя меры валютнага рэгулявання адбыліся цяпер, а не ў студзені або лютым, адзначыла эксперт. Прадаўцы і пакупнікі атрымалі час, каб «пераварыць» сітуацыю, узважыць свае магчымасці, ацаніць рызыкі, каб ужо ў студзені дзейнічаць на цвярозую галаву.

Наш эксперт упэўнена, што пасля ўвядзення збору на куплю валюты ў першую чаргу скароціцца колькасць «чыстых» пакупнікоў, якія набываюць кватэры выключна за грашовыя сродкі. У той жа час узрасце доля жыллёвых «ланцужкоў», пры якіх звычайна кампактную кватэру мяняюць на прасторнае жыллё з даплатай, або наадварот. Пакупнікі жылля, якія захоўвалі зберажэнні ў доларах або еўра, ад валютных перыпетый моцна не пацярпелі. Тут яны могуць нават крыху выйграць. Праўда, цяжкасці ў фінансавай сферы закранулі інтарэсы спажыўцоў, якія маюць сродкі на рублёвых дэпазітах, або калі яны планавалі прыцягваць крэдытныя сродкі.

Рашэнне адкладваць «аперацыю» з куплі кватэры можа дорага каштаваць як прадаўцам, так і пакупнікам. Калі для першых празмернае чаканне можа азначаць зніжэнне кошту кватэр у доларах, то для другіх — вялікія рублёвыя выдаткі. Паколькі заробкі беларусы атрымліваюць у рублях, то вырашыць кватэрнае пытанне ім стане куды складаней.

Разам з тым пакупнікі могуць абыграць сітуацыю на рынку на сваю карысць. Ім стала прасцей дамовіцца пра саступкі, у тым ліку аб прадастаўленні сур'ёзнай зніжкі. У гэтым выпадку памер дыскаунту можа складаць каля 5 тысяч долараў. А гэта з улікам і без таго невялікіх коштаў з'яўляецца вялікай падмогай пакупнікам. Сёння прадаўцы разумеюць, што калі цяпер пойдуць на саступкі, то ў выніку апынуцца ў выйгрышы. Разам з тым верагодна, што ў сярэдзіне студзеня, калі рынак больш-менш стабілізуецца, разлічваць на буйную зніжку будзе сумніўна, удакладніла сваю пазіцыю намеснік дырэктара.

Цяпер развіццё падзей шмат у чым нагадвае зацішша ў 2011 годзе. Тады сітуацыя ў фінансавай сферы прывяла да зніжэння актыўнасці на рынку жылля, аднак кошт «квадрата» на другасным рынку знізіўся нязначна — недзе на 5–10%. Пры гэтым ужо праз некалькі месяцаў прадаўцы сталі адыгрываць страчаныя пазіцыі.

«Паводле нашых прагнозаў, бягучая сітуацыя будзе развівацца, як і тры гады таму — часовае зацішша і невялікае зніжэнне коштаў, пасля чаго ўступіць у дзеянне правіла «хто не паспеў своечасова купіць або прадаць — той спазніўся». Цэны на жыллё знаходзяцца на нізкім узроўні — рынак цяпер на баку пакупніка», — патлумачыла эксперт.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# НА ТЫМ ЖА МЕСЦЫ Ў ТОЙ ЖА ЧАС...

## або Што паглядзець у Новы год на розных «кнопках»?

**Кожны, безумоўна, вырашае для сябе, уключаць у навагоднюю ноч тэлевізар альбо наогул абысціся без яго. І ўсё ж па традыцыі, большасць з нас паглядвае ў бок экрана: гаспадыні — падчас прыбірання і гатавання святочных страў, госці — слухаючы бой курантаў і віншаванні кіраўніка краіны, дзеці — «гартаючы» каналы ў пошуках мультфільмаў, пакуль дарослыя занятыя іншымі справамі. «Звязда» падрыхтавала невялікі перадсвяточны дапаможнік — агляд таго, што прапануюць для беларусаў айчынныя тэлеканалы.**

### Свята ў вялікім горадзе і Каляды з Ружай

У эфіры тэлеканала «Беларусь 1» у апошнія дні адыходзячага і першыя Новага года адбудзецца прэм'ера новага сезона арыгінальнага дакументальнага праекта Агенцтва тэленавін **«Лёс гігантаў. Дзяржкіно»**, дзе раскажуць пра навагоднія шэдэўры савецкага кінематографа. **29 снежня** можна ўбачыць першы фільм цыкла, прысвечаны музычнай казцы «Навагоднія прыгоды Машы і Віці» (СССР, 1975 г.). **30 снежня** гледачоў чакае расповед пра ўсімі любімую музычную меладраму рэжысёра Таццяны Ліёзнавай «Карнавал» (СССР, 1981 г.). **1 студзеня** ўвазе гледачоў прапануецца трэці фільм, прысвечаны народнай музычна-камедыйнай казцы ад рэжысёра Канстанціна Бромберга «Чарадзеі» (СССР, 1982 г.). А чацвёртая серыя цыкла **4 студзеня** распавядзе пра легендарную музычную камедыю Эльдара Разанава «Карнавальная ноч» (СССР, 1956 г.).




**31 снежня** навагодні штурм па-жаночы зладзяць у эфіры інтэрактыўнага ток-шоу **«Дзень у вялікім горадзе»**. За 11 гадзін да Новага года ў прамым эфіры «Беларусь 1» адкрыецца «Святочнае бюро навагодніх знаходак». На працягу гадзіны будзе працаваць стол замоў, які дасць магчымасць усім ахвотным патэлефанаваць у прамы эфір і павіншаваць сваіх родных і блізкіх. У «Пакоі гаданняў» чароўныя вядучыя ток-шоу навучаць магічным штучкам, а ў «Аддзеле развагі» дадуць урок, як з тугі не заснуць за святочным сталом.

Праграма **«Terra incognita. Беларусь невядомая» 31 снежня ў 15.25** запрашае гледачоў «Беларусь 1» на «калядкі, бліны ды аладкі»! У пошуках самага беларускага Новага года здымачная група праграмы адправілася ў Пастаўскі раён, дзе жыве прапрапрадзядуля Дзеда Мароза — Зюзя. Аўтары праекта праверылі на трываласць усе міфы і сустрэліся не толькі з Зюзем, але і з яго світай: Карачуном, Завеяй, Напасцю... Пабывала каманда праграмы і на сапраўдных Калядах! Гледачы даведаюцца аб традыцыях святкавання Новага года ў Беларусі і ролі кожнага міфалагічнага персанажа свята — ад Казы і да Зімы і Сонца. Прыме ўдзел у святочным выпуску праграмы і сапраўдная каза Ружа — сімвал надыходзячага года.

Навагодні вечар і ноч пасля бою курантаў прыхільнікі «Беларусь 1» змогуць правесці за праглядам любімага кіно, якое самі выбралі падчас народнага галасавання ў эфіры «Радыус FM». І віншаваць гледачоў будуць героі любімых фільмаў. У топе-3 лепшых аказаліся сёлета карціны: тры часткі навагодняга кінаальманаха **«Ёлкі»** (першы фільм будзе ў эфіры ў **19.15**, другі — **21.50**, а трэці — у **00.05**).

У першы дзень новага года гледачоў таксама чакаюць любімыя фільмы і святочныя прэм'еры. А ў **15.50** тэлеканал «Беларусь 1» пакажа Навагодняе дабрачыннае свята для дзяцей з удзелам Прэзідэнта Беларусі **«Галоўная ёлка краіны. «Школа юных марозаў»**.

### Падарожжа вакол свету ў кампаніі з Брусам Уілісам

Тым, хто марыць дадаць у святкаванне Новага года нотку экзотыкі, цяпер неабавязкова купляць пуцёўку ў далёкія краіны. **31 снежня «Тэлераніца»** дорыць сваім гледачам двухгадзінны тур вакол свету на неабмежаваную колькасць персон і віншаванні са святам ад беларускіх селебрыці.

**У навагоднюю ноч** «Беларусь 2» пакажа цалкам квадралогію **«Моцны арэшак»** пра бясстрашнага паліцэйскага і змагара за справядлівасць Джона МакКлейна (Брус Уіліс).

**1 студзеня** распачнецца паказам гістарычнага мультфільма **«Анастасія»**. У вячэрнім эфіры тэлеканал пакажа фантастычную камедыю **«Ноч у музеі»**, а затым яе працяг — фільм **«Ноч у музеі 2»**. А вось **3 студзеня** добры пераход ад адпачынку да карысных спраў можа атрымацца, калі паглядзець праграму **«Беларуская кухня» ў 10.10**, дзе расказуць і пакажуць, як гатаваць галубцы з грыбамі. Актуальная прапанова асабліва для тых, хто трымае пост перад Раством.

### Музыка, прэм'еры і інтэрактыў

Святочную атмасферу тэлевізіёншчыкі пастараліся стварыць для гледачоў яшчэ за тыдзень да Новага года: **з 23 па 31 снежня** ў эфіры «Беларусь 3» выходзяць канцэрты вялікага праекта **«Навагоднія вечары ў Маладзечне»** — музычныя сустрэчы з папулярнымі артыстамі і калектывамі.

**27 снежня** выйдзе ў эфір спецыяльны выпуск тэлевіктарыны **«Размаўляем па-беларуску»**, удзельнікам якога, камандам супрацоўнікаў ТБ і радыё, трэба будзе перакласці на родную мову найскладанейшыя фразеалагізмы, радкі вядомых навагодніх песень, а ў фінале — адгадаць і прадоўжыць адну з «тэматычных» песень.

А непасрэдна **31 снежня** аўтарскі праект **«Дыя@блог»** запросіць у госці не кагосьці-небудзь, а галоўнага Дзеда Мароза краіны, вобраз якога ўжо не адзін год увасабляе заслужаны артыст Беларусі Уладзімір Радзівілаў. Разам з вядучай Крысцінай Смольскай і гледачамі казачны «дзед» паразважае «Пра прыгожае».

Яшчэ адзін сюрпрыз для гледачоў — магчымасць павіншаваць сваіх родных і сяброў у тэлеэфіры ў межах акцыі **«Віншуем Беларусь разам!»** Зрабіць гэта можа кожны ахвотны, запоўніўшы спецыяльную форму на сайце www.3belarus.by. Віншаванні прымаюцца да 11 раніцы 31 снежня. А бягучы радок з самымі незвычайнымі, цёплымі і шчырымі пажаданнямі будзе запушчаны ў першыя хвіліны 2015 года падчас музычнай праграмы **«100 песень для Беларусі. Навагодняя ноч»**. У ёй будуць прадстаўлены




лепшыя народныя песні ў сучаснай апрацоўцы і выкананні папулярных артыстаў, якія былі запісаны ў межах праграмы «Наперад у мінулае».

А **1 студзеня** канал прадставіць новы праект **«Песні навагодніх начэй»**. На працягу дня цыкл з 9 праграм (кожная «ахопіць» 10 гадоў, пачынаючы з 1930-х) раскажа, як раней адзначалі Новы год, якія спявалі песні, з якога моманту 1 студзеня стала афіцыйным выхадным, калі савецкім дзецям вярнулі ёлку і як яе ўпрыгожвалі ў розныя перыяды, а таксама чым частавалі гасцей. Вядучы праекта Сяргей Кравец, дарэчы, не толькі суправаджае праграмы папулярнымі тады песнямі, але і «прымярае» на сябе модныя ў тыя часы вобразы. А яшчэ гэтыя расповеды будуць звязаны з фільмамі, знятымі ў адпаведныя дзесяцігоддзі: «Па шчупаковым загадзе», «Два байцы», «Карнавальная ноч», і г.д.

### Успомніць усё

Першы нацыянальны спартыўны тэлеканал вырашыў не рыхтаваць да свята маштабных спецыяльных праектаў, але падрыхтаваў для гледачоў іншы — магчыма, куды больш значны падарунак. **31 снежня і 1 студзеня** ў эфіры «Беларусь 5» аматары спорту змогуць прыгадаць лепшыя моманты хатняга чэмпіянату свету па хакеі-2014 (будуць паказаны гульні Беларусь — Казахстан, Швейцарыя — Беларусь, Беларусь — Германія і Латвія — Беларусь), а таксама перажыць наноў самыя приемныя для нас імгненні зімовай Алімпіяды ў Сочы — біятлонныя гонкі, якія прынеслі тры залатыя медалі Дар'і Домрачавай і «бронзу» Надзеі Скардзіна, і «залатыя» феерычныя выступленні беларускіх фрыстайлістаў Алы Цупер і Антона Кушніра.



Фота БЕЛТА.





### Падарожжа ў лета

Сёлета тэлеканал вырашыў вярнуцца да звыклай забаўляльнай праграмы і прадставіць своеасаблівы зборнік з музычнымі віншаваннямі ад вядомых беларускіх артыстаў. «Цікавінка» праекта — у месцы, выбраным для здымак навагодняга канцэрта. Прыгадаўшы павер'е «Як Новы год сустрэнеш, так яго і правядзеш», тэлевізіёншчыкі вырашылі чакаць прыходу 2015-га ля мора, у спякотным і сонечным горадзе Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў — Дубаі, і ўжо адтуль зладзіць трансляцыю музычнага святочнага эфіру. «Чаму менавіта Дубай? — дапытваліся мы ў калег-тэлевізіёншчыкаў з АНТ, але тыя толькі загадкава ўсміхаліся і адказвалі: — Таму, што навагодняя ноч — самы чароўны час, калі могуць адбывацца самыя неверагодныя рэчы. І, пагадзіцеся, хто з нас не марыў трапіць з зімы ў лета? Вось мы і паспрабуем здзейсніць мару і падзяліцца з усімі гледачамі добрым настроем на наступны год».




Здзейсніць **«Палёт у Новы год»** з задавальненнем пагадзіліся тэлевядучыя Андрэй Бонд, Марына Грыцук, Іван Падрэз, Дзяніс Кур'ян, Віталь Карпанаў, а таксама добрыя два дзясяткі беларускіх артыстаў: гурты «БЕЗ БІЛЕТА», «Топлес», «Лас-Вегас», Аня Шаркунова, Аляксей Хлястоў, Ларыса Грыбалёва, Тэа, Аляксандр Саладуха, Святлана Стацэнка і ўдзельнікі дзіцячага тэлепраекта «Я спяваю!», а таксама многія іншыя. Што ў выніку атрымаецца з гэтага падарожжа, ці ўсім мытня ў аэрапорце дасць «дабро» і ці накрые каго раптоўная акліматызацыя — даведаемся ў святочную ноч **з 31 снежня на 1 студзеня.**

Акрамя таго, **31 снежня** ў эфіры АНТ — шэраг старых любімых кінафільмаў, сярод якіх «Пёс Барбос і незвычайны крос» і «Самагоншчыкі», каляровая «Папялушка» і «Каралева бензакалонкі», плюс, безумоўна, «Іронія лёсу». А тых, хто ўрэшце стоміцца ад кінапрагляду, чакаюць на «Дыскатэцы 80-х», якая працягнецца амаль да 8 раніцы 1 студзеня. У першыя дні новага года кінамарафон прадоўжаць фільмы «Джэнтльмены ўдачы», «Марозка», «Адзін дома», «Аватар» і «Іронія лёсу. Працяг».

### Падарунак для бландзінкі

Гледачоў тэлеканала СТБ напярэдадні Новага года чакае шмат гумару. Пачнецца святочны гумарыстычны марафон **31 снежня ў 22.00** спецыяльным выпускам праграмы **«На тым жа месцы ў той жа час»**, якая на адзін вечар зменіць сваю назву. «На тым жа месцы ў Новы год» будзе разведваць, што чакае ў падарунак сапраўдная бландзінка, як пераканаць дзяцей застацца дома на Новы год, і знойдзе адзінага ў Беларусі таксіста, што ў гэтую ноч акажацца ў студыі, а не за «баранкай». Кампанію вядучаму Антону Мартыненку складуць таксама вядомыя беларускія артысты.



Пасля бою курантаў на тэлеканале СТБ вас чакае Клуб Вясёлых і Знаходлівых. У спецыяльным навагоднім выпуску КВЗ гледачы атрымаюць кактэйль адборнага гумару ад лепшых майстроў жанру: камандаў з Днепрапятроўска, Астрахані, Белгарада, Даўгапруднага і, безумоўна, з Мінска.

**Алена ДРАПКО,**
**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## АЎТОРАК, 30 СНЕЖНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.50** Зона Х.
**9.10, 21.45 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Меладрама «Шчаслівы Пашка».**
**12.10, 16.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «На шляху да сэрца».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 2.00 Серыял «Сваты 4».**
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20, 1.10** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**23.50** Лёс гігантаў.
**0.20** Вечар цяжкага дня.
**1.45** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.35** Тэлебарометр.
**9.05, 16.35 Серыял «Сашка».**
**10.05** «Fitnews».
**10.40, 21.40 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**11.40, 22.45 Серыял «Віртуозы».**
**12.45** Ікра.
**13.20, 18.50 Серыял «Універ».**
**15.35** «Comedy woman».
**17.50, 0.00 Серыял «Таксі».**
**20.55** Рэальны свет.
**21.25** Спортлато 6 з 49.
**21.30** КЕНО.
**23.55** Хачу ў тэлевізар!
**0.50** Скетч-шоу «Халі-галі».

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50, 14.10, 19.00, 0.05** «Калейдаскоп».
**8.05 «Светлая асоба». Камедыя.**
**9.20, 17.00** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**9.45 «Рыжык у Залюстэр'і». Дзіцячы фільм. 1-я і 2-я серыі.**
**11.45** «Шчасце Алены». Дак. фільм.
**12.10** «Навагоднія вечары ў Маладзечне». Арт-група «Беларусы».
**13.05** «Подых струн». Музычная праграма Госці: Лепшыя выканаўцы.
**13.45, 23.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага мастака Беларусі Гаўрыіла Вашчанкі.
**14.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**14.55** «Навагодні тыдзень». Сольны канцэрт Аляксея Хлястова.
**15.45 «Як каваль шчасця шукаў». Фільм-казка.**
**17.30 «Вясёлая моладзь». Камедыя.**
**19.15 «Формула кахання». Камедыя.**
**20.45** Калыханка.
**21.10 «Свежына з салютам». Камедыя.**
**22.20** «Дыя@блог». «Пра мову».
**22.50** «Навагоднія вечары ў Маладзечне». Вакальна-інструментальны ансамбль «Чараўніцы».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 1.15** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**8.55, 23.20** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Расія — Швецыя.
**10.50** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Віцязь» (Маскоўская вобл.).
**12.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Суонсі».
**14.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Бернлі».
**16.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вест Хэм» — «Арсенал».
**18.25** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск).
**20.45** Мастацкая гімнастыка. Baby Cup.
**22.50** Спорт-кадр.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15 Маст. фільм «Зімовы раман».**
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «ЗАГС».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Маст. фільм «Стылягі».**
**23.30 Камедыя «Уцекачы».**
**1.05** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00** «Тыдзень спорту».
**9.35** «Такі лёс».
**10.40** «Мае цудоўныя...».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.35 Маст. фільм «Дачка Д'Артаньяна».**
**16.10** «Далёкія сваякі».
**16.50** «Следакі».
**17.30** «Ваенная тайна».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Міміно».**
**22.05** «Глядзець усім!».
**23.00 Серыял «Энігма». Заключныя серыі.**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**8.45** «Агульны інтарэс».
**9.10 Маст. фільм «Яна Вас кахае».**
**10.30 Маст. фільм «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў».**
**12.10, 2.20** Дак. фільм «З нагоды. Бясконцы Новы год».
**13.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Дарогі Індыі».**
**15.05, 4.55 Серыял «Іншы свет».**
**15.30, 5.25 Серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак «.**
**16.20** Ток-шоу «Слова за словам».
**17.10 Маст. фільм «Каханне прыходзіць не адно».**
**19.20 Маст. фільм «Пасылка з Марса».**
**21.35** Фестываль Аўтарадыё «Дыскатэка 80-х».
**0.10** Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**0.45 Маст. фільм «Зігзаг удачы».**



**3.10 Маст. фільм «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Прамы эфір».
**12.50** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.45** Навіны — Беларусь.
**14.30 Маст. фільм «Снег на галаву».**
**16.20** «Уся Расія».
**17.10 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.50 Серыял «Па гарачых слядах».**
**21.50, 23.55 Маст. фільм «Паласа адчужэння».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.20** «Пракурорская праверка».
**9.30, 10.30 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.30** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.40** «Справа густу».
**15.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.40, 16.35 Серыял «Лясны».**
**17.55** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.45 Серыял «Чужы».**
**23.30 Драма «Муха».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 13.15, 18.55, 20.55, 23.35** «Надвор'е».
**7.05 М/ф «Казка пра залатога пеўнічка».**
**7.40 Камедыя «Гэта вясёлая планета».**
**9.20** «Кінаблакнот».
**9.30, 15.05** «Тэлемагазін».
**9.50 Серыял «Айцец Браўн».**
**10.45 Трылер «Палёт».**
**13.20 Серыял «Чарцяня».**
**15.50 М/ф «Коткін дом».**
**16.30** «Золата маўчання».
**16.55 Серыял «Эўрыка».**
**17.45 Серыял «Ведзьмы ўсходняга ўзбярэжжа».**
**18.40** «Тваё здароўе».
**19.00 Меладрама «Вікторыя і Альберт».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.10 Камедыя «Без істэрыкі».**
**23.05 Серыял «Прыгарад».**

### ВТБ

**6.00, 4.45** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.00, 19.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.30** Серыял «Варонiны».
**9.30, 13.30** Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
**10.00, 20.00** Серыял «Кухня 4».
**11.00** «Навагодні тыдзень ежы».
**12.00** Серыял «Аманда О».
**13.00** Серыял «Супер Макс».
**14.00** «Знаёмцеся, мужчына!».
**15.00, 1.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00** Меладрама «Добры хлопец».
**18.30, 3.00** «Лаві момант».
**21.10** Камедыя «Капітаны».
**23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00** «Дурні і дарогі».
**3.30** Юбілейны канцэрт «Непаседы — 20 гадоў. Палёт нармальны».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.30** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15** Маст. фільм «Гараж».
**12.50** «Больш, чым каханне». Святлана Немаляева і Аляксандр Лазараў.
**13.35** «Я чакаю цябе...». Кінаканцэрт.
**14.05** Успамінаючы Святаслава Бэлзу. «Лінія жыцця».
**15.10** Маст. фільм «Клуб самазабойцаў, або Прыгоды тытулаванай асобы». 2-я серыя.
**16.15** Дак. фільм «Уладзімір Басаў».
**17.00** Соль Габета, Генія Кюхмаер, Сабіна Мэер. Гала-канцэрт у аўстрыйскім замку Графенег.
**18.00, 1.55** Дак. фільм «Сапраўдная Мэры Попінс».
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** У гонар Алены Абразцовай. «Оперны баль» у Вялікім тэатры.
**22.35** Юбілей Алены Чайкоўскай. «Лінія жыцця».
**23.50** Маст. фільм «Мы з джаза».
**1.15** Дак. фільм «Мы з джаза. Прачнуцца знакамітым».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Навагодні каляндар». 1965 год.
**7.00** Канцэрт групы «Машына часу». 1990 год.
**7.45, 1.30** Канцэрт «Парад зорак». 1993 год.
**8.30** Музыка ў эфіры. Навагодні выпуск праграмы. 1991 год.
**9.35, 18.45** Канцэрт замежнай эстрады.
**10.00, 4.05** Маст. фільм «Тэатр».
**11.15** Фрагменты навагодняга «Блакітнага агеньчыка». 1970 год.
**12.00** «Лімпапо». 1992 год.
**12.40** Фільм-канцэрт «Чатыры інтэрв'ю з зімой». 1983 год.
**13.50, 19.45** Маст. фільм «Фантазіі Вяснухіна».
**15.00** «Мюнхгаўзен-клуб». 1992 год.
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**17.00, 23.00** «Шынок 13 крэслаў». 1969 год.
**18.00** «Эстрада-67». Навагодні канцэрт. 1-я частка.
**19.10** «Віншаванні «Навагоднюю агеньчыку». 1981 год.
**21.00** «Аншлаг! Аншлаг!». Навагодняя праграма. 1990 год. 1-я частка.
**0.00** «Пад знакам задыяка». «Стралец». 1993 год.
**2.20** «Зорны час». Навагодні выпуск. 1993 год.
**3.00** Кінаканцэрт «Зоркі замежнай эстрады і кіно вітаюць вас!». 1987 год.
**5.15** «Залаты шлягер». 1994 год.

### EUROSPORT

**3.00** All Sports.
**10.30, 15.00, 18.45** Біятлон.
**11.30** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
**12.30** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.
**13.30, 17.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**15.45, 19.45, 21.15, 2.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Турнэ 4-х трамплінаў.
**22.00** Фігурнае катанне. Паказальныя выступленні.
**1.00** Аўта- і матаспорт.
**1.15** Конны спорт. Спаборніцтвы па скачках.
**2.15** WATTS.
**2.30** Ралі. Ралі рэйд.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.25, 14.50** Серыял «Я і місіс Джонс».
**7.00** Камедыя «Бацька нявесты».
**8.45** Камедыя «Бацька нявесты-2».
**11.25** Прыгоды «Янкі пры двары караля Артура».
**13.15** Камедыя «Цяжарны».
**15.50** Камедыя «Цыпачка».
**17.35, 22.00** Серыял «Сваты 1».
**18.45** Камедыя «Містэр Магу».
**20.20** Камедыя «Адпачынак у наручніках».
**23.10** Камедыя «Махляры».
**0.50, 2.50** Скетчком «Паміж намі».
**1.15** Камедыя «Цёрнер і Хуч».
**3.10** Серыял «Вялікая школа».
**4.10** Баявік «Кілеры».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.15, 14.15, 4.00** «Доктар І.».
**7.45, 18.55, 2.40** Серыял «Каханне і пакаранне».
**9.20, 4.25** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.15, 17.55** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.15, 16.55** «Шчырая размова».
**13.15** Серыял «Аўрора».
**14.50, 0.20** Серыял «Каменская».
**15.50, 22.30** «Зорныя гісторыі».
**20.40, 1.10** Серыял «Самазванка». Заключная серыя.
**23.30** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.15** Драма «Рэйчэл выходзіць замуж».
**8.10** Драма «Скарб».
**10.05** Трылер «Анёлы і Дэманы».
**12.25** Драма «Мы — адна каманда».
**14.40** Трылер «Філосафы: Урок выжывання».
**16.30** Драма «Каханне і гонар».
**18.05, 3.50** Драма «Сем жыццяў».
**20.10** Драма «Самая п'яная акруга ў свеце».
**22.10** Камедыя «Настаўнік англійскай».
**23.50** Драма «Гавана, я люблю цябе».



**2.05** Камедыя «Знесеныя».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** М/ф «Пра Фядота-стральца, удалага малайца».
**8.00** Камедыя «Рэальны тата».
**9.40** Прыгоды «Краіна добрых дзетачак».
**11.10** Фільм-казка «Варвара краса — доўгая каса».
**12.40, 1.50** Камедыя «Навагодні шлюб».
**14.25** Мюзікл «Стылягі».
**16.45** Камедыя «Ёлкі 3».
**18.30** Камедыя «Аднакласнікі. ru: НаCLICKай удачу».
**20.20** Камедыя «Цётачкі».
**22.10** Камедыя «Мужчына ў маёй галаве».
**0.15** Камедыя «Мужчына з гарантыяй».
**3.40** Драма «Салодкая жанчына».
**5.25** Камедыя «Свята Нептуна».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Інжынерныя ідэі.
**7.00** Гульні розуму.
**8.00** Займальная навука.
**9.00, 14.00, 20.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**10.00, 15.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**11.00** Аўта-SOS.
**12.00** Мегазаводы.
**13.00, 19.00** Скарбашукальнікі.
**16.00** Дзікая прырода Расіі.
**18.00, 3.00** Браты па зброі.
**21.00, 1.00, 4.00** Больш чым фокусы.
**22.00, 2.00, 5.00** Упраўленне натоўпам.
**23.00** Храм фашызму.
**0.00** Зона 51: Сакрэтныя файлы ЦРУ.

### DISCOVERY

**8.00** Залатая ліхаманка.
**8.50, 22.00** Хуткія і гучныя.
**9.40, 14.15, 21.35** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.40, 21.05, 5.45** Як гэта зроблена?
**10.35** Золата джунгляў.
**11.30, 6.10** Забойныя дылемы.
**12.25, 17.25** Паляўнічыя на рэлiквіі.
**13.20, 1.55** Top Gear.
**15.10, 4.55** У пагоні за класікай.
**16.05, 7.05** Махінатары.
**18.20** Пякельныя трасы.
**19.15** Траса Калыма.
**20.10** Голыя і напалоханыя.
**23.00** Мяцежны гараж.
**0.00** Легендарны аўтамабіль.
**1.00, 4.05** Склады: бітва ў Канадзе.
**2.50** Сапраўдныя аферысты.
**3.40** Маланкавыя катастрофы.

## Што ў Новы год больш важна: дзе яго правесці ці з кім?

**Сяргей МАКАРЭЙ, намеснік дырэктара тэлеканала «Беларусь 3»:**



— З узростам ужо іншая ацэнка ўсіх гэтых свят. Калі адзначаецца каталіцкае Раство, то я, як праваслаўны, не святкую яго, бо ў нас пост, і таму весяліцца, ладзіць застоллі — не вельмі добра. Новы год таксама прыпадае на час посту... І наогул навагоднія святы — гэта час, калі трэба спакойна пасядзець, падсумаваць тое, што было, нейкія планы намеціць на будучыню. Я ўжо ў гулянях розных не ўдзельнічаю і апошнія гады адзначаю гэтыя святы з сям'ёй. Не ведаю, ці прычына ў тым, што не клічуць нікуды, альбо мне не хочацца... У маладосці па гасцях хадзіў, а цяпер хочацца прачынацца дома і бачыць побач блізкіх.

**ДАРЫЯ, спявачка:**



— Для мяне Новы год — свята, якое я вымушана праводзіць на працы. З аднаго боку, я не магу, як многія людзі, пасядзець з сябрамі, але затое маю магчымасць палепшыць фінансавы дабрабыт сваёй сям'і. Улічваючы тое, што ў мяне маленькае дзіця, у мінулыя гады не магла працаваць так інтэнсіўна, як некаторыя мае калегі. А цяпер сын падрос. Наогул, на Новы год мы робім дома ўсё, каб адчувалася святочная атмасфера: упрыгожваем кватэру, ставім ёлку, і родныя заўсёды прыйдуць на дапамогу, калі трэба нешта прыгатаваць на святочны стол альбо прыдумаць забавы... Раство заўжды святкуем у сямейным коле. Лічу, што падчас навагодніх свят трэба імкнуцца вытрымліваць «залатую сярэдзіну» паміж працай і сям'ёй. Бо вельмі важна нікога не абдзяліць увагай, знайсці час і словы для тых, хто іх патрабуе.

**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, журналіст, пісьменнік, галоўны дырэктар замежнага вяшчання Беларускага радыё:**



— Ведаеце, я лічу, што гэта не прынцыпова. Самае аптымальнае — калі сустракаць свята там, дзе хочацца, і ў той кампаніі, з кім хочацца. Тады атрымліваецца выдатна. Якраз гэта такое свята ўтульнае, сямейнае і, можа, у нечым нават сакральнае — дзе ёлка, пажаданні і спадзяванні на новы год. Безумоўна, юным і маладым хочацца патанцаваць у нейкай вялікай зале, але людзі больш сталыя, на мой погляд, імкнуцца адзначыць навагоднія святы ў цёплай, сяброўскай кампаніі. Аднойчы ў мяне была сітуацыя, калі Новы год збіраўся сустракаць у адным месцы, але не атрымалася, і я пайшоў у іншае, дзе мяне таксама чакалі. Пасля той выпадковай сустрэчы ў мяне ўтварылася сям'я.

**Алена ДРАПКО.**

## СЕРАДА, 31 СНЕЖНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05 Меладрама «Шчаслівчык Пашка».**
**12.10 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «На шляху да сэрца».**
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**16.05, 6.00 Серыял «Сваты 4».**
**17.05, 4.30** «Вялікая розніца». Навагодні выпуск. 1-я і 2 я частkі.
**19.15 Камедыя «Ёлкі».**
**21.00** Панарама.
**21.50 Камедыя «Ёлкі 2».**
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**0.05 Камедыя «Ёлкі 3».**
**1.45 Камедыя «Скарб».**
**3.05 Меладрама «З Новым годам, мамы!».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 18.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.25 Серыял «Сашка».**
**10.05** Беларуская кухня.
**10.40 Дэтэктыў «Падмані мяне». 2-я серыя.**
**11.40 Серыял «Віртуозы».**
**12.45** Вышэй за дах.
**13.15, 18.45 Серыял «Універ».**
**15.35** Рэпарцёр.
**17.30 Серыял «Таксі».**
**18.35** Спортлато 5 з 36.
**18.40** КЕНО.
**20.55** Рэальны свет.
**21.20** «Comedy woman».
**23.30, 0.05** З Новым годам!
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.

**0.25 Баявік «Моцны арэшак».**
**2.30 Баявік «Моцны арэшак 2».**
**4.25 Баявік «Моцны арэшак 3: Адплата».**
**6.25 Баявік «Моцны арэшак 4».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабраранак».
**8.00, 12.50, 17.25** «Калейдаскоп».
**8.15 «Формула кахання». Камедыя.**
**9.45, 16.55** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.10 «Свежына з салютам». Камедыя.**
**11.30** «Навагоднія вечары ў Маладзечне». Вакальна-інструментальны ансамбль «Чараўніцы».
**12.25** «Наперад у мінулае».
**13.05, 4.10** «Дванаццаць месяцаў». М/ф.
**13.55 «Тры арэшкі для Папялушкі». Фільм-казка.**
**15.20, 0.55, 1.55, 3.00, 4.00, 6.40** М/ф.
**16.00** «Навагодні тыдзень». Канцэрт з удзелам групы «Да Вінчы», Іны Афанасьевай, групы «Тяни-Толкай», Аляксандра Саладухі, Ірыны Дарафеевай, Іскуі Абалян.
**17.35** «Подых струн». Новы год з бардам Аляксандрам Балем.
**18.15 «Чарадзеі». Камедыя. 1-я і 2-я серыі.**
**20.45** Калыханка.
**21.20 «Снягурку выклікалі?». Камедыя.**
**22.25** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
**22.50** «Навагоднія вечары ў Маладзечне». Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры».
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**0.05, 1.05, 2.05, 3.05** «Сто песень для Беларусі». Навагодняя ноч.
**5.00** «Шчаўкунчык, або Яшчэ адна калядная гісторыя». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Беларусь — Казахстан.
**10.05** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Швейцарыя — Беларусь.
**12.20** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Беларусь — Германія.
**14.25** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Латвія — Беларусь.
**16.35** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Біятлон. Гонка пераследу. Жанчыны.
**17.30** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Біятлон. Індывідуальная гонка. Жанчыны.
**19.25** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Фрыстайл. Акрабатыка. Фінал. Жанчыны.
**20.40** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Біятлон. Масстарт. Жанчыны.
**21.45** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Фрыстайл. Акрабатыка. Фінал. Мужчыны.
**22.50** Мастацкая гімнастыка. Baby Cup.
**0.55** Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Чэхія — Расія.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 20.00** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!». Навагодні выпуск.
**10.25** «Кантрольная закупка». Навагодні выпуск.
**11.05, 13.05, 16.10** Навіны спорту.
**11.10 Камедыі «Сабака Барбос і незвычайны крос», «Самагоншчыкі».**
**11.50** «Модны прыгавор». Навагодні выпуск.
**13.10 Легендарнае кіно ў колеры. «Папялушка».**
**14.40 Камедыя «Каралева бензакалонкі».**
**16.15** «Дзве зоркі». Навагодні выпуск.
**18.05, 20.30 Камедыя «Іронія лёсу, або З лёгкай парай!».**
**22.10** Праводзіны старога года.
**23.25, 00.05** «Палёт на Новы год».
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.

**1.40** «Навагодняя ноч».
**4.40** «Дыскатэка 80-х».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10** «СТБ-спорт».
**9.00** «Мінск і мінчане».
**9.35** «Цэнтральны рэгіён».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Мае цудоўныя...».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Чыстая праца».
**14.40 Маст. фільм «Мiміно».**
**16.50** «Следакі».
**17.30** «Новы год па-руску».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дарагая перадача».
**20.45 Маст. фільм «Адзінокім даецца інтэрнат».**
**22.25, 2.20** «На тым ка месцы ў Новы год».
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**0.05** «Навагодняя ноч з лепшымі камандамі КВЗ».
**3.05** «Легенды Рэтра FM». Лепшае.

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**8.45** «Зроблена ў СССР».
**9.10 Маст. фільм «Навагоднія прыгоды Машы і Віці».**
**10.20** М/ф «Шчаўкунчык і мышыны кароль».
**11.45, 17.55** М/ф.
**13.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Звычайны цуд».**
**16.15 Маст. фільм «Не можа быць!».**
**19.40 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў».**
**21.30 Маст. фільм «Рэальнае каханне».**
**23.30** Фестываль Аўтарадыё «Дыскатэка 80-х».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Камедыя «Саламяны капялюшык».**
**9.30 Маст. фільм «Чарадзеі».**

**12.15 Фільм-казка «Марозка».**
**13.35** М/ф «Маша і мядзведзь».
**13.50, 16.50** Навіны — Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Уся Расія».
**15.00 Маст. фільм «Час збіраць».**
**17.00** М/ф .
**17.15 Камедыя «Паласаты рэйс».**
**18.55** «Лепшыя песні». Святочны канцэрт з Дзяржаўнага Крамлёўскага палаца.
**20.40** «Каралі смеху».
**23.00** «Навагодні парад зорак».
**23.55** Навагодні зварот Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі У.У. Пуціна.
**0.00** Навагодні Блакітны агеньчык-2015.
**4.30** Вялікая навагодняя дыскатэка.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.15 Драма «Муха».**
**8.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**8.20, 10.20, 13.50 Серыял «Лясннік».**
**13.20** «Справа густу».
**21.00, 0.00** «Анатомія года».
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі.
**0.35** «Эээх, разгуляй!».
**3.50** Новы год на НТБ. «The Best» — лепшае».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.00, 19.20, 21.25, 23.50** «Надвор'е».
**7.05** М/ф «Падаў мінулагодні снег».
**7.30 Камедыя «Гусарская балада».**
**9.10 Серыял «Айцец Браўн».**
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30 Камедыя «Малышка з Беверлі-хілз».**
**12.05 Камедыя «Чарадзеі».**
**14.45, 19.05** «Тэлемагазін».
**15.30** М/ф «12 месяцаў».
**16.30 Серыял «Эўрыка».**
**17.25 Камедыя «Прыгоды Элаізы».**
**19.25 Камедыя «Ой мароз, мароз».**
**21.15** «Вечарніца».
**21.30 Камедыя «Чыста адэская гісторыя».**

### ВТБ

**6.10, 5.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**9.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**10.00** Серыял «Кухня 4».
**11.00** «Навагодні тыдзень ежы».
**12.00** «Наш Новы год».
**19.00** «Уральскія пельмені».
**3.30** Камедыя «Кароль вечарынак».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15** Маст. фільм «Прыгонная актрыса».
**12.50** «Астравы». Сяргей Філіпаў.
**13.35** «Я хачу дабра». Мікаэл Тарыявердзіеў.
**14.05** Успамінаючы Юрыя Любімава. «Лінія жыцця».
**15.10** Маст. фільм «Клуб самазабойцаў, або Прыгоды тытулаванай асобы». 3-я серыя.



**16.15** Дак. фільм «Любоў Палішчук».
**16.55** Юбілей радыёстанцыі «Маяк». Фільм-канцэрт.
**18.05** Маст. фільм «Мы з джаза».
**19.25** Дак. фільм «Мы з джаза. Прачнуцца знакамітым».
**20.05** «Юрый Нікулін. Класіка жанру».
**20.30** «Эльдар Разанаў. Музыка кіно».
**22.30, 0.00** «Навагодняя ноч з Уладзімірам Співаковым».
**23.55** Навагодні зварот Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі У.У. Пуціна.

**1.30** Білі Джоэл. Канцэрт на стадыёне «Шы».
**2.25** М/ф для дарослых: «Падаў леташні снег», «Брэк!».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Лімпапо». 1992 год.
**6.40** Фільм-канцэрт «Чатыры інтэрв'ю з зімой». 1983 год.
**7.50, 13.45** Маст. фільм «Фантазіі Вяснухіна».



**9.00** «Мюнхгаўзен-клуб». 1992 год.
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00, 17.00** «Шынок 13 крэслаў». 1969 год.
**12.00, 18.00** «Эстрада-67». Навагодні канцэрт.
**12.45, 18.50, 20.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**13.10** «Віншаванні «Навагоднаму агеньчыку». 1981 год.
**15.00, 21.10** «Аншлаг! Аншлаг!». Навагодняя праграма. 1990 год. 1-я частка.
**19.20** Маст. фільм «Мелодыя на два галасы». 1-я серыя.
**22.55** «У навагоднюю ноч...». 1992 год. 1-я частка.
**0.00** «Музычная настальгія».
**5.15** Фрагменты навагодняга «Блакітнага агеньчыка». 1970 год.

### EUROSPORT

**10.30, 2.30** Ралі. Ралі рэйд.
**10.45** Аўта- і матаспорт.
**11.00, 14.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Турнэ 4-х трамплінаў.
**11.30** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
**12.30** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.
**13.30** Фігурнае катанне. Паказальныя выступленні.

**17.00, 17.45, 22.15, 0.45** WATTS.
**17.15, 21.45, 0.15, 2.45** All Sports.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.05, 3.10** Серыял «Я і місіс Джонс».
**7.00** Камедыя «Бацька нявесты-2».
**8.40** Камедыя «Цяжарны».
**11.05** Камедыя «Цыпачка».
**12.50** Камедыя «Містэр Магу».
**14.30, 17.35** Серыял «Сваты 1».
**15.45** Камедыя «Махляры».
**18.40** Камедыя «Адпачынак у наручніках».
**20.20** Камедыя «К-9: Калядныя прыгоды».
**21.45, 0.40, 5.45** Скетчком «Паміж намі».
**22.00** Серыял «Сваты 2». 1-я серыя.
**23.10** Камедыя «Шосты элемент».
**1.15** Прыгоды «Янкі пры двары караля Артура».
**4.10** Камедыя «Цёрнер і Хуч».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30** Фільм-казка «Навагоднія прыгоды Машы і Віці».
**9.45** «Панекка і кулінар».
**10.20** М/ф «Дванаццаць месяцаў».
**11.15, 4.15** Маст. фільм «Прадаецца дача».
**13.15** Маст. фільм «Чарадзеі».



**16.20** Маст. фільм «Дзядуля ў падарунак».
**18.10** Маст. фільм «Звычайны цуд».

**20.55** Маст. фільм «Адзін дома».
**22.55** Маст. фільм «Адзін дома 2».
**1.10** «Даўно не бачыліся!» Навагодні канцэрт.
**2.40** Маст. фільм «Формула кахання».

### ТБ1000

**6.10** Меладрама «Здзелка».
**8.00, 13.40** Камедыя «Знесеныя».
**9.40** Драма «Сем жыццяў».
**11.50, 21.45** Камедыя «Без істэрыкі!».
**15.20** Камедыя «Лак для валасоў».
**17.20** Фэнтэзі «Гары Потэр і філасофскі камень».
**20.00, 4.20** Камедыя «Раство з няўдачнікамі».
**23.30** Драма «Скарб».
**1.25** Камедыя «Джэк і Джыл: Каханне на чамаданах».
**2.45** Баявік «Нацыянальная бяспека».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Камедыя «Ёлкі 2».
**8.10** Мюзікл «Стыляґі».



**10.30** Камедыя «Зімовы сон».
**12.20** Камедыя «Свята пад замком».
**13.50** Камедыя «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі».
**15.10** Камедыя «Назад — да шчасця, або Хто знойдзе Сінюю птушку».
**17.05** Камедыя «Са мною вось што адбываецца».
**18.30** М/ф «Як зладзіць пяро Жар-Птушкі».

**20.20** Камедыя «Ёлкі 2».
**22.10** Камедыя «Ёлкі 3».
**23.55** Камедыя «З новым годам, мамы!».
**1.30** Камедыя «Дублёр».
**3.00** Драма «Чэмпіёны».
**4.35** Камедыя «Зімовы сон».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Інжынерныя ідэі.
**7.00** Гульні розуму.
**8.00** Займальная навука.
**9.00, 14.00, 20.00** Больш чым фокусы.
**10.00, 15.00** Упраўленне натоўпам.
**11.00** Аўта-SOS.
**12.00** Мегазаводы.
**13.00, 19.00** Скарбашукальнікі.
**16.00** Дзікая прырода Расіі.
**18.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**21.00, 1.00, 4.00** Звярыны патруль.
**22.00, 2.00, 5.00** Шаша праз пекла.
**23.00** Прызнанні нацыстаў.
**0.00** Лініі Наска.
**3.00** Браты па зброі.

### DISCOVERY

**8.00, 10.35** Золата джунгляў.
**8.50** У пагоні за класікай.
**9.40, 14.15, 21.35** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.40, 21.05, 5.45** Як гэта зроблена?
**11.30, 6.10** Не спрабуйце паўтарыць.
**12.25, 17.25, 22.00** Склады: бітва ў Канадзе.
**13.20, 1.55** Top Gear.
**15.10, 4.55** Курс экстрэмальнага кіравання.
**16.05, 7.05** Махінатары.
**18.20** Легендарны аўтамабіль.
**19.15** Мяцежны гараж.
**20.10** Хуткія і гучныя.
**23.00** Дарога па прыбытку.
**0.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**1.00, 4.05** Багажныя войны.
**2.50** Сапраўдныя аферысты.
**3.40** Маланкавыя катастрофы.

## Гараскоп на



**АВЕН.** Можаце чакаць значных фінансавых паступленняў, паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча. Тыдзень спрыяльны і для асабістага жыцця. Новых знаёмстваў пакуль не прадбачыцца, а вось унесці яснасць у цяперашнія адносіны вы зможаце. Будуць наладжаны кантакты з сябрамі і роднымі. Але варта быць больш асцярожнымі ў сваіх дзеяннях, асабліва ў выказваннях, бо ёсць рызыка быць некарэктнымі. Сярэдзіна тыдня — выдатны момант для стварэння падмурка будучага прасоўвання па кар'ернай лесвіцы.



